Robert Bosch Stiftung

«Дасягнуць прымірэння, што сягае праз межы, зможа не Еўропа муроў, а кантынент, які пазбавіць свае межы здольнасці падзяляць.»
Рыхард фон Вайцзэкер, 1985

Robert Bosch Stiftung GmbH
Heidehofstraße 31
70184 Stuttgart

16.12.2011

**Запрашэнне да ўдзелу**
**Каледж імя Карла Фрыдрыха Гёрдэлера**
**«Належнае дзяржаўнае кіраванне»**

для 20 маладых лідэраў з дзяржаўнага сектара з Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі, Турцыі і Украіны
8 – 29 верасня 2012 года ў Берліне і Варшаве

:: Вы працуеце ў грамадскім сектары і жадаеце актыўна ўдзельнічаць у фармаванні стасункаў паміж прадстаўнікамі розных краін?
:: Вы хочаце павышаць сваю кваліфікацыю і працаваць у супольнай сетцы разам з палітычна актыўнымі еўрапейцамі?
:: Вы любіце распрацоўваць і ажыццяўляць новыя ідэі ды інавацыйныя канцэпцыі?

**Каледж імя Карла Фрыдрыха Гёрдэлера «Належнае дзяржаўнае кіраванне» запрашае Вас да:**

- навучэння на семінарах,
- актыўнага ўдзела ў дыскусіях і майстар-класах,
- нарошчвання кантактаў у Германіі і ў краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы і да
- садзейнічання развіццю эфектыўнага кіравання і ажыццяўлення адміністрацыйных рэформаў.

Праца каледжа праводзіцца ў супрацоўніцтве з Нямецкім таварыствам знешняй палітыкі (Deutsche Gesellschaft für Auswärtige Politik e.V.).

Прафесар Гюнтэр Ферхойген, былы віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі, суправаджае ўдзельнікаў у якасці дырэктара каледжа.

**Асноўныя напрамкі работы каледжа**

**1. Дзейнічаць адказна:** Удзельнікі знаёмяцца з рэформамі і мадэрнізацыяй дзяржаўнага кіравання, а таксама асвойваюць канцэпцыі належнага кіравання: Як арганізаваны органы грамадскага кіравання ў ЕС? Якія выкарыстоўваюцца шляхі і платформы для камунікацыі? Якім чынам органы дзяржаўнага і грамадскага кіравання могуць быць перабудаваны і працаваць больш эфектыўна з дапамогай eGovernance? Якім чынам адбываецца супрацоўніцтва са сферай палітыкі?

Гэты блок выконваецца ў супрацоўніцтве з нямецкім універсітэтам і па заканчэнні ўдзельнікам выдаецца Сертыфікат.

**2. Погляд за кулісы:** Удзельнікі сустрэнуцца з экспертамі з грамадскага сектара, з галіны палітыкі і кіравання, змогуць паглыбіць сваё разуменне палітычнага жыцця і ўзаемаадносін у Германіі і ЕС, і, такім чынам, ўсталяваць важныя кантакты з прадстаўнікамі прафесійнай супольнасці. Асноўнай мэтай Каледжа з'яўляецца ўзаемнае навучанне і абмен перадавым вопытам.

Да кожнага ўдзельніка прыстаўляецца дасведчаны кіраўнік-кансультант з кола кантактаў Нямецкага таварыства знешняй палітыкі (DGAP), які падзеліцца сваім вопытам і дапаможа далучыцца да прафесійнай супольнасці ў Германіі.

**3. Стварэнне ўстойлівага развіцця:** Каледж дазваляе ўдзельнікам распрацаваць і ажыццявіць уласны праект на месцах працы па тэме належнага кіравання, які быў бы карысны для іх уласнай арганізацыі.

Да заяўцы на ўдзел павінен прыкладацца эскіз праекта. Падчас Каледжа ўдзельнікі канкрэтызуюць праект на майстар-класе па праектным менеджменце і працуюць у суправаджэнні кансультанта па праектах. Удзельнікі атрымліваюць магчымасць у вызначаныя дні праходзіць стажыроўку ў розных установах, якія знаходзяцца ў Берліне і ў ваколіцах у адпаведнасці з профілем іх працы. Пасля гэтага ўдзельнікі самастойна рэалізуюць праект у сваіх краінах.

Праз паўгода ўдзельнікі Каледжа могуць арганізаваць рэгіянальную сустрэчу і абмяняцца прамежкавымі вынікамі. У пачатку наступнага навучальнага цыкла ў 2013 г. ўдзельнікі зноў сустракаюцца ў Берліне і прадстаўляюць вынікі праектаў.

Мова правядзення семінараў - нямецкая.
Калі неабходна, ўдзельнікам прадастаўляецца магчымасць асвяжыць моўныя веды на курсе ў Германіі з 27 жніўня па 8 верасня года 2012 года.

**Падача заявак**

Калі ласка, адпраўляйце Вашу заяўку выключна праз наш інтэрнэт-партал: https://bewerbung.boschstiftung-portal.de/onlinebewerbung/

Тэрмін падачы заявак: 12 сакавіка 2012 г.

**Вы можаце падаць заяўку на ўдзел, калі адпавядаеце наступным крытэрыям:**

– армянскае, азербайджанскае, беларускае, грузінскае, малдаўскае, рускае, турэцкае або ўкраінскае грамадзянства,
– Вы пражываеце ў гэтым рэгіёне,
– скончаная вышэйшая адукацыя з выбітнымі адзнакамі,
– праца ў грамадскім сектары ў якасці першага працоўнага досведу (дзяржаўнае кіраванне, дзяржаўныя кампаніі, некамерцыйныя арганізацыі) і падтрымка з боку вашага працадаўцы,
– наяўнасць пэўнай ідэі праекта і цікавасць да эфектыўнага кіравання і палітычнай думкі,
– усведамленне грамадскай адказнасці і актыўная грамадзянская пазіцыя, валоданне кіраўнічымі якасцямі, а таксама
– вельмі добрае веданне як нямецкай, гэтак і англійскай мовы.

**Пакрыццё расходаў**

Фонд Роберта Боша бярэ на сябе наступныя расходы:

Для ўдзелу ў сумоўі:
– Дарога з пастаяннага месца знаходжання да Берліна для сумоўя і назад
– Выдаткі на пражыванне і харчаванне падчас сумоўя
– Выдаткі на атрыманне візы
– Медыцынскае страхаванне

Падчас моўных курсаў:
– Прыезд і ад'езд з роднага горада да месца правядзення моўнага курса, ад месца моўнага курса ў Берлін
– Расходы на курс нямецкай мовы (4 гадзіны ў дзень, рашэнне аб прадастаўленні месцаў на моўнай курс прымае Фонд Роберта Боша)
– Пражыванне з харчаваннем (сняданак і абед, без вячэры)
– Выдаткі ў памеры € 300 на харчаванне, грамадскі транспарт і дадатковыя платныя паслугі Гётэ Інстытута
– Выдаткі на атрыманне візы
– Медыцынскае страхаванне

Пад час каледжа

– Выдаткі на дарогу ў Берлін і назад (за выключэннем моўнага курса)
– Пражыванне з харчаваннем (сняданак і абед, без вячэры), а таксама аплата расходаў на харчаванне ў памеры € 400
– Кантактная паездка ў Варшаву
– Выдаткі на атрыманне візы
– Медыцынскае страхаванне
– Грамадскі транспарт у Берліне і Варшаве
– Семінары

**Інфармацыя аб праграме і арганізатарах:**

**Карл Фрыдрых Гёрдэлер (Carl Friedrich Goerdeler)**
Каледж названы ў гонар юрыста і барацьбіта руху Супраціву Карла Фрыдрыха Гёрдэлера (1884 – 1945). Гёрдэлер быў обер-бургамістрам Лейпцыга з 1930 да 1936 г., аднаго з нямногіх буйных гарадоў, у мэрыі якога не было членства ў нацысцкай партыі. Пасля сваёй адстаўкі ў пратэст супраць нацыянал-сацыялістычнай палітыкі ў Лейпцыгу ён змог удзельнічаць у Супраціве нацыянал-сацыялістычнаму рэжыму, працуючы на сваёй пасадзе ў фірме Бош. Як адзін з заснавальнікаў руху грамадзянскага Супраціву Гёрдэлер у сваіх запісках распрацоўваў планы канстытуцыйна-палітычных рэформаў і праекты будучага еўрапейскага саюза дзяржаў. Пасля краху змовы 20 ліпеня 1944 г. ён быў пакараны смерцю 2 лютага 1944 г.

**Фонд Роберта Боша**
адзін з вялікіх фондаў Германіі, звязаных з прыватнымі кампаніямі. Ён быў заснаваны ў 1964 г. і працягвае ажыццяўляць агульнакарысныя намаганні заснавальніка фірмы і дабрачынца Роберта Боша (1861 – 1942). Фонд працуе, галоўным чынам, у галінах паразумення народаў, адукацыі і здароўя.

**Цэнтр Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы**
Фонду Роберта Боша Нямецкага таварыства знешняй палітыкі арганізуе канферэнцыі, а таксама сімпозіумы экспертаў і круглыя сталы, прысвечаныя аналізу актуальных палітычных падзей у Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе. Цэнтр суправаджае многія праграмы Фонду Роберта Боша для спрыяння будучым спецыялістам, адказным за прыняцце рашэнняў, і маладым навукоўцам з Цэнтральнай ды Ўсходняй Еўропы і з Германіі.

Дадатковую інфармацыю аб праграме і працэдуры падачы заявак можна знайсці: www.goerdeler-kolleg.de

Robert Bosch Stiftung



## Кантакты

**Кіраўніцтва праграмы**
Маркус Люкс (Markus Lux)
Фонд Роберта Боша
(Robert Bosch Stiftung GmbH)
www.bosch-stiftung.de

**Кантакт для кандыдатаў**
Мары-Лена Май (Marie-Lena May)
Тэлефон: +49 (0) 30/25 42 31-13
Факс: +49 (0) 30/25 42 31-16
m.may@dgap.org
www.dgap.org
Deutsche Gesellschaft fur Auswartige
Politik e. V. (DGAP)
Zentrum fur Mittel- und Osteuropa der
Robert Bosch Stiftung
Rauchstrase 17/18
D-10787 Berlin
www.goerdeler-kolleg.de